**Н.У.Стэльмашонак,** *выкладчык*

# ДА ПЫТАННЯ ВЫКЛАДАННЯ КАМПАЗІЦЫІ Ў МАСТАЦКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ (на прыкладзе кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУ культуры і мастацтваў)

Кампазіцыя з'яўляецца асноўнай катэгорыяй мастацкай творчасці і разглядаецца як сродак дасягнення жанрава-стылістычнага адзінства, візуальнай цэласнасці, закончанасці і ўстойлівасці ў арганізацыі ўспрымання вобразаў. Прадмет "Кампазіцыя" – гэта навукова абгрунтаваная сістэма паняццяў, ведаў, практычных уменняў і навыкаў, якая рэгулюе і накіроўвае дзейнасць мастака на працягу яго творчасці.

Мэта вучэбнага працэсу – развіваць творчыя здольнасці студэнта, яго бачанне і вобразнае мысленне. Як правіла, у мастацкую навучальную ўстанову паступаюць адораныя студэнты. Але для рэалізацыі творчых задаткаў патрэбны спрыяльныя ўмовы, якія неабходна падтрымліваць на працягу вучэбнай дзейнасці. Гэтаму ў значнай меры спрые правільны падбор тэм і заданняў па спецыяльных дысцыплінах, у прыватнасці па кампазіцыі.

Мастацкая адукацыя прадугледжвае мэтанакіраванае фарміраванне творчага светаўспрымання і эстэтычным уяўленняў на падставе гуманітарнай падрыхтоўкі, комплекснага развіцця інтэлектуальна-творчых здольнасцей і мастацкіх навыкаў студэнта. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва – гэта мастацтва праектавання і вырабу рэчаў, якія павінны адпавядаць не толькі высокім ужытковым, але і эстэтычным якасцям. У адрозненне ад твораў выяўленчага мастацтва вобразная выразнасць гэтых прадметаў звязана з функцыяй, матэрыялам, канструкцыяй, тэхналогіяй і навакольным асяроддзем. Аснову любога твора ДПМ складае кампазіцыя – аб'яднанне асобных элементаў у адзінае гарманічнае цэлае на падставе заканамернасцей мастацтва. Сродкі кампазіцыі служаць для мадэліравання вобраза і структуры вырабу, а прыёмы – для ўпарадкавання формы, калі вобраз аб'екта ўжо дастаткова акрэслены.

На працягу вучэбнага працэсу студэнты працуюць у розных жанрах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Перад імі ставіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мэта: надаць рэчы чатыры групы якасцей – функцыянальную, марфалагічную, тэхналагічную і мастацка-вобразную. Валоданне выяўленча-графічнымі і кампазіцыйнымі сродкамі, навыкамі мадэліравання і макетавання формы і аб’ёмна-прасторавай структуры аб’екта дазволіць студэнту дастаткова поўна раскрыць змест тэмы, сфарміраваць мастацка-кампазіцыйны вобраз.

Рэалізацыю прапаноў па прафесійным навучанні мастака-прыкладніка павінна забяспечыць адпаведная вучэбная праграма. Можна зазначыць неабходнасць уключэння ў праграму такіх заданняў па праектаванні, якія прадугледжваюць сааўтарства студэнтаў у іх выкананні, а таксама заданняў, якія развіваюць у студэнтаў навыкі цэласнага і сістэмнага мастацкага мыслення.

У педагагічнай практыцы гістарычна склаліся два спосабы пабудовы вучэбных праграм: канцэнтрычны і лінейны. Пры канцэнтрычнай пабудове матэрыял вывучаецца больш паглыблена і пашырана на наступнай ступені навучання. У выпадку лінейнай пабудовы кожная наступная частка вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца паслядоўным працягам папярэдніх. Размеркаванне вучэбнага матэрыялу ў праграме залежыць ад зместу, характару дысцыпліны, яе месца ў сістэме вучэбных прадметаў, пачатковай падрыхтоўкі навучэнцаў і г.д. І паколькі авалоданне матэрыялам патрабуе ведання шматлікіх правілаў і заканамернасцей выяўленчага мастацтва, заданні павінны будавацца па канцэнтрычным прынцыпе і вывучацца на працягу ўсяго тэрміну навучання спецыяліста.

Пры засваенні дысцыпліны “Кампазіцыя” на практычным узроўні неабходна звярнуць увагу на наступныя педагагічныя рэкамендацыі:

– студэнт павінен разумець мэты і шляхі выканання чарговага задання;

– заданні патрабуюць строгай паслядоўнасці;

– для павышэння эфектыўнасці самастойнай работы студэнтаў выкарыстоўваюцца заданні разнастайныя і цікавыя для выканання;

– выкладчык падзяляе заданні па кампазіцыі на часткі і кіруе паслядоўнасцю іх выканання.

Змест заданняў можа быць разнастайным. Некаторыя з іх развіваюць якасці мыслення будучага мастака-прыкладніка, іншыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіраваны на ўдасканаленне яго майстэрства ў графічнай тэхніцы і макетных матэрыялах.

Сёння існуе неабходнасць змянення шэрагу тэм, некаторых заданняў, скарачэння часу на аўдыторнае выкананне практыкаванняў і пераводу часткі практычных заняткаў у самастойныя. Практычныя заданні павінны быць пабудаваны па прынцыпе паслядоўнага ўскладнення задач (ад арганізацыі плоскасці да стварэння аб’ёмна-прасторавых структур). Практыкаванні з аб’ёмам карысна весці ў кірунку пошуку пластыкі формы ад простых геаметрычных да складаных структурных і аб’ёмных форм.

Пэўная частка вучэбнага часу прысвячаецца вывучэнню прынцыпаў геаметрычнай і структурнай камбінаторыкі з модульных элементаў. Гэты раздзел трэба пачынаць з уводнай лекцыі аб модулі як першасным элеменце розных матэрыяльных (і не толькі) форм. Камбінаторыка раскрываецца як метад мыслення і канкрэтнай дзейнасці ў розных галінах праектавання. Пэўную частку праграмы складаюць заданні на засваенне прыёмаў мастацкай стылізацыі прыродных аб’ектаў з паралельным вывучэннем спосабаў падпарадкавання натурнага матэрыялу матэрыялам ДПМ. Паралельна ўвага надаецца прынцыпам формаўтварэння ў ДПМ, метадам распрацоўкі двух- і трохмерных аб’ектаў і дасягнення гарманічнага спалучэння іх розных якасцей, а таксама адпаведнасці зместу арнаментальных элементаў іх форме і функцыі.

Значную частку заняткаў мяркуецца прысвяціць працы над аб’ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Асобная ўвага надаецца лагічнаму асэнсаванню сувязей элементаў пры пабудове груп у сюжэтных вырашэннях, прынцыпам і метадам кампазіцыйнай пабудовы мастацкага вобраза. На заканчэнне вывучэння курса кампазіцыі студэнтам прапануецца праца з інтэр’ерам і творам ДПМ у ім: вывучаюцца розныя віды і матэрыялы, функцыі і прыёмы ўключэння твора ў інтэр’ер.

Вопыт паказаў, што заданні па кампазіцыі (і асабліва па фармальнай кампазіцыі), якія студэнты выконваюць часам з вялікай зацікаўленасцю, застаюцца ў іх памяці як адасобленыя практыкаванні, якія не маюць нічога агульнага з далейшай практычнай дзейнасцю. Аб гэтым сведчыць тое, што на старшых курсах студэнты часам адчуваюць цяжкасці нават пры вырашэнні задач па кампаноўцы свайго праекта на лісце ці, напрыклад, пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

размяшчэнні элементаў на вырабе. Відавочна, што трэба абстрактныя задачы ўводнага курса не толькі суправаджаць вуснымі тлумачэннямі іх прыналежнасці да далейшай практычнай дзейнасці мастака, але падмацоўваць тэарэтычныя выкладкі ілюстратыўным матэрыялам, прывядзеннем прыкладаў з мастацкай практыкі.

Ёсць спадзяванне, што ўлік выказаных прапаноў будзе садзейнічаць росту эфектыўнасці працэсу навучання і павышэнню ўзроўню кваліфікацыі выпускнікоў у галіне народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

---

1. *Композиция* в декоративно-прикладном искусстве: метод. пособие / Рос. гос. пед. ун-т им. А.И.Герцена; авт.-сост. А.А.Белов, Е.М.Гвоздев. – СПб.: Образование, 1992. – 87 с.

2. *Композиция* в промышленном и декоративно-прикладном искусстве: сб. статей / Ленинградское высшее художественно-промышленное училище им. В.И.Мухиной; сост. Е.Н.Лазарев. – Л., 1973. – 104 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ